Актуальные проблемы современной медицины и фармации 2019 [Электронный ресурс] : сб. материалов LXXIII Междунар. науч.-практ. конф. студентов и молодых ученых, 5-17 апр. Минск, 2019 г.

*Я. А. Астражынскі*

# АДРАДЖЭННЕ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 1980-Х – 1990-Х ГГ.

***Навуковы кіраўнік: ст. выкл. І. І. Лубінскі***
*Кафедра філасофіі і паліталогіі*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, г. Мінск*

*Y. A. Astrazhynski*

# THE REVIVAL OF THE ROMAN CATHOLIC CHURCH IN BELARUS IN THE LATE 1980TH – 1990TH XX C.

***Tutor: senior lecturer I. I. Lubinski***
*Department of Philosophy and Politology*
*Belarusian State Medical University, Minsk*

**Рэзюмэ.** Навукова-практычнае даследванне прызначана складанай гісторыі адраджэння структур Рымска-Каталіцкага Касцёла на Беларусі ў канцы 1980-х – 1990-х гг. XX ст. Нягледзячы на забарону каталіцызму з боку савецкіх уладаў, Рымска-Каталіцкі Касцёл адыгрываў станоўчую ролю ў развіцці грамадства Беларусі. Мэта - даследваць адраджэнне і функцыяванне каталіцкага касцёла ва указаны перыяд ў Беларусі, вызначыць гістарычную абумоўленасць адраджэння.

**Ключавыя словы:** Рымска-Каталіцкі Касцёл, адраджэнне, Беларусь, каталіцызм, функцыянаванне.

**Resume.** Scientific and practical research is intended to the complex history of the revival of the structures of the Roman Catholic Church in Belarus at the end of the 1980th – 1990th. XX c. Despite the ban of Catholicism by the Soviet authorities, the Roman Catholic Church has played a positive role in the development of society in Belarus. The aim - to explore the revival and the functioning of the Roman Catholic Church during this period in Belarus, to determine the historical conditioning of its revival.

**Keywords:** the Roman Catholic Church, the revival, Belarus, Catholicism, functioning.

**Актуальнасць.** Адраджэнне каталіцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1980-я – 1990-я гг. яшчэ не да канца вывучана і патрабуе далейшага даследвання, а Каталіцкі Касцёл працягвае адыгрываць і сёння важную ролю ў развіцці грамадства Беларусі.

**Мэта:** даследваць адраджэнне і функцыяванне Рымска-Каталіцкага Касцёла ў перыяд з 1980-х па 1990-я гады ў Беларусі, вызначыць гістарычную абумоўленасць адраджэння каталіцызму ў Беларусі.

**Задачы:**

1. Вызначыць гісторыю адраджэння каталіцызму ў Беларусі у 1980-1990гг.
2. Прааналізаваць развіццё і дзейнасць Рымска-Каталіцкага касцёла ў Беларусі ў гэты перыяд.
3. Прааналізаваць уплыў Рымска-Каталіцкага Касцёла на розныя сферы жыццядзейнасці беларусаў.

**Матэрыялы і метады.** Выкарыстоўваліся наступныя матэрыялы: дакументы Каталіцкага Касцёла, навуковыя даследванні па тэме, інтэрв'ю са сведкамі падзей. Выкарыстоўваліся наступныя метады: аналіз, сінтэз, дэдукцыя, індукцыя, сістэмны аналіз.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Цяжка знайсці сферы чалавечага жыцця і краіны, дзе

б хрысціянства, існуючае на працягу шматлікіх стагоддзяў, не зрабіла свайго велічнага ўплыву. Гістарычна і геаграфічна склалася так, што жыхары беларускіх зямель знаходзіліся і знаходзяцца пад уплывам двух розных культурна-рэлігійных традыцый, паміж двума сіламі культурнага і рэлігійнага ўздзеяння: паміж Канстанцінопалем (праваслаўе) і Рымам (каталіцызм). Па колькасці прыхільнікаў і па ступені ўплыву на жыццё і адносіны ў грамадстве Каталіцкі Касцёл займае адно з вядучых мест на Беларусі.

З пачаткам «перабудовы» ў СССР адбыліся значныя змены ў грамадскім і палітычным жыцці краіны. Апошнія гады існавання ўлады саветаў і існавання БССР з'яўляліся перыядам карэнных пераўтварэнняў рэлігійнага жыцця: вернікі ўсё часцей падавалі хадайніцтвы аб адкрыцці касцёлаў, узрасла колькасць заяваў з просьбамі аб рэгістрацыі рэлігійных аб'яднанняў, афіцыйныя ліца, ведаючы аб неафіцыйнай дзейнасці каталіцкіх супольнасцяў, не перашкаджалі ёй. Якасным чынам паўплывалі на адраджэнне 80-90-х гадоў XX стагоддзя і далейшы лёс Каталіцкага Касцёла на Беларусі некалькі вельмі важный падзей: святкаванне юбілею 1000-годдзя хрышчэння Кіеўскай Русі ў 1988 года і сустрэча 1 снежня 1989 г. Генеральнага сакратара ЦК КПСС М.С.Гарбачова з Папам Рымскім Янам Паўлам II (малюнак 1).



**Мал.1** – Сустрэча Генеральнага сакратара ЦК КПСС М.С.Гарбачова з Папам Рымскім Янам Паўлам II 1 снежня 1989 года

Адным з галоўных станоўчых зрухаў быў пачатак працэсу перадачы вернікам раней адабраных у іх культавых будынкаў. Распачаўшыся ў 1988 годзе, працэс вяртання святынь стаў незваротным. Адначасова аднаўлялі сваю дзейнасць рыма-каталіцкія парафіі, якія працавалі ў нелегальных умовах без афіцыйнага дазволу і былі зняты з уліку, а таксама рэгістраваліся парафіі, якія былі зачынены ў пасляваенныя гады [2]. Так, з 1948 г. вялі барацьбу за права на свабоду веравызнання каталікі г.п. Шарашова, бо па распараджэнню ўладаў касцёл быў зачынены для вернікаў і выкарыстоўваўся як

складское памяшканне Пружанскага райспажыўсаюза. Вернікі павінны былі ехаць 63 кіламетры ў г.п. Ружаны каб наведаць бліжэйшую святыню. Шарашоўскім вернікам ўдалося дабіцца вяртання касцёла. У жніўні 1988 г. была зарэгістравана парафія ў г.п. Відзы, у храме якой размяшчалася спартыўная зала Браслаўскага вучылішча сельскай гаспадаркі і аднавіла дзейнасць парафія ў в. Германовічы Шаркоўшчынскага раёна. 16 лістапада 1988 г. была зарэгістрыравана абшчына Парафіянава Пастаўскага района, 28 лістапада – Старыя Васілішкі Шчучынскага раёна і інш.

Пазіцыя Рымска-Каталіцкага Касцёла Беларусі працягвала ўтрымліваюца, адбываецца далейшае наладжванне адносін паміж Апостальскай Сталіцаю - Ватыканам і незалежнай Рэспублікай Беларусью. З 1989 года па 1993 год на Беларусі працаваў першы нунцы – пасол арцыбіскуп Франчэска Каласуона. Апостальскі нунцы – дыпламатычны прадстаўнік Папы Рымскага ў дзяржавах, з якімі Ватыкан мае дыпламатычныя адносіны, прызначаецца галоўным чынам у дзяржавы, дзе пашырана каталіцтва [6]. Такім чынам было наладжана супрацоўніцтва на розных узроўнях у галіне духоўных, культурных, адукацыйных і іншых сувязяў паміж Ватыканам і Беларусью.

У сувязі з святкаваннем юбілею 1000-годдзя хрышчэння Кіеўскай Русі ў 1988 г. СССР было афіцыйна аб'яўлена аб поўнай свабодзе веравызнання і адкрыцця зачыненых культавых будынкаў [1]. Пачатак працэсу перадачы вернікам раней адабраных у іх культавых будынкаў стаў адным з галоўных станоўчых зрухаў. Яскравымі прыкладамі адраджэння і актыўнага ўдзела вернікаў ў жыцці грамадства і дзяржавы з'явіліся вельмі важныя для духоўнага аднаўлення Беларусі падзеі вяртання касцёла Св.Сымона і Св.Алены, Архікатэрдальнага Касцёла Беларусі імя Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мінску. У канцы 1980-х і пачатку 1990-х гадоў ўзнікла велізарная і аб'ектыўная патрэба ў духоўнай адукацыі і духоўным адраджэнні, бо моладзь Беларусі апынулася не ў стане успрымаць  каталіцкую духоўную і культурную традыцыю. З падзеннем жалезнай заслоны і набытай магчымасцю выязджать па - за межы краіны, усе больш маладых людзей жадалі набываць сучасную еўрапейскую адукацыю і каталіцкую адукацыю ў тым ліку. Атрымаўшы свабоду веравызнання, Каталіцкі Касцёл на Беларусі сутыкнуўся з вялікім недахопам святароў, катэхетаў і выкладчыкаў. З гэтай мэты пачалі адраджацца розныя навучальныя установы і шэраг рэлігійных выданняў.

Культура Беларусі на працягу ўсёй гісторыі існавання дзяржавы адчувала на сабе моцны ўплыў рымска-каталіцкай рэлігіі, якая садзейнічала росквіту і адухаўленню культуры. Музыка, літаратура, жывапіс, выяўленчае мастацтва і іншыя галіны культурнага жыцця дзяржавы  з'яўляліся сферай інтарэсаў Рымска-Каталіцкага Касцёла. Калі 30 гадоў таму Рымска – Каталіцкі Касцёл на Беларусі пачаў сваё адраджэнне, гэта адбывалася не толькі ў напрамку абвяшчання Божага Слова,  салебрацыі сакрамэнту, служэння бліжняму, але і у культурнай галіне [5].

У 1989 годзе ў Белдзяржфілармоніі быў створаны тэатр аднаго акцёра «Зніч», які пачынае сваю дзейнасць пры касцёле Св.Сымона і Св.Алены ў Мінску з 1993 года. Тэатр працуе ў жанры монаспектакля, папулярызуючы творы беларускай і сусветнай класікі. Ужо ў той час у рэпертуары тэатра знаходзяцца не толькі гістарычныя, драматычныя і паэтычныя спектаклі, але і духоўныя, спектаклі для дзяцей і батлейкі. Намаганнямі ксяндза – магістра, пробашча касцёла Св.Сымона і Св.Алены Ўладзісла-

ва Завальнюка (малюнак 2) ў 1992 годзе была зарэгістравана радыёперадача «Голас Душі». 11 верасня 1993 г.упершыню на ўсю Беларусь на Дзяржаўным радыё выйшла ў эфір першая хрысціянская радыёперадача. Трансляцыя ажыццяўлялася адну гадзіну кожную суботу, нядзелю і ў вялікія святы. У канцы двухтысячнага года радыёвяшчанне было перанесена ў Архікатэдральны касцёл імя Найсвяцейшай Марыі Панны.



**Мал. 2** – Ксёндз-магістр Уладзіслаў Завальнюк – значная асоба ў адраджэнні Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі ў канцы 1980-х – 1990-х гг. XX ст.

На працягу стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі Рымска - Каталіцкі Касцёл вёў сваю дабрачынную дзейнасць галоўным чынам праз парафіі і манаскія ордэны, якія займаліся непасрэдна аказаннем дапамогі жабракам, хворым, інвалідам і сіротам. Больш за 200 манаскіх ордэнаў у большай ці меншай ступені аказвалі дапамогу ўсім тым, хто жыве ў нястачы, ўтрымлівалі бальніцы, дзіцячыя прытулкі, дамы для бедных і састарэлых. У савецкі перыяд да самой перабудовы ў Савецкім Саюзе дабрачынная дзейнасць Рыма - Каталіцкага Касцёла была забаронена і не практыкавалась. Арганізаваная дабрачынная дзейнасць Рыма - Каталіцкага Касцёла адрадзілася ў Беларусі ў канцы 1980-х і пачатку 1990-х, калі пачаўся афіцыйны працэс аднаўлення Каталіцкага Касцёла і яго структур.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і выпрабаваніі, Рымска-Каталіцкі Касцёл працягвае адыгрываць станоўчую ролю ў развіціі навукі, культуры і іншых сфер жыццядзейнасці грамадства Беларусі.

У канцы 1980-х і на працягу 1990-х гг. пасля шматгадовай антырэлігійнай палітыкі адбываецца ажыўленне дзейнасці Рымска-Каталіцкага Касцёла і складваецца сучасная структура каталіцтва ў Беларусі. у 1989 годзе паміж урадамі СССР і Польскай Народнай Рэспублікі быў заключаны дагавор, у адпаведнасці з якім у Беларусь запрашаліся 50 ксяндзоў - палякаў для працы на духоўнай ніве. У перыяд 1993 – 1995 гг. яшчэ 40 святароў прыбылі на Беларусь з Польшчы па прыватным запрашэнням ад беларускіх вернікаў. З 1987 па 1989 гг. быў зарэгістраваны 51 касцёл, стаяла пытанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГМУ

аб адкрыцці яшчэ 21 святыні. Разам з тым на 162 існуючых парафіі прыпадала толькі 62 святары. Адзін ксёндз абслугоўваў тры і больш парафій. Часам за дзень яму даводзілася праязджаць па 200 і больш кіламетраў, каб задаволіць рэлігійныя патрэбы ўсіх вернікаў. У 1991-1999 гг. было створана 4 дыяцэзіі, якія падзяляліся на 31 дэканат. На 1 снежня 2000 года на Беларусі налічвалася 405 каталіцкіх парафій, 266 святароў, 7 кляштараў, 5 добраахвотных каталіцкіх суполак. У навучальным 1997/1998 годзе ў Гродненскім катэхічным інстытуце працаваў 21 выкладчык і налічвалася 85 студэнтаў, асноўная частка якіх была з Гродзенскай дыяцэзіі. У тым жа навучальным годзе ў катэхічным каледжы ў Баранавічах працавала 13 выкладчыкаў і налічвалася 76 навучэнцаў, якія праходзілі навучэнне на працягу трох гадоў. 17 чэрвеня 1995 года ўпершыню ў гісторыі Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Гродна адбылося пасвячэнне ў сан святара. У 1994 пачалі выдавацца каталіцкія часопісы «Дыялог» і «Ave Maria». Касцельныя хоры, тэатральныя пастаноўкі, канцэрты, мастацкія выставы, школа арганістаў, вячары арганнай музыкі, каталіцкае кіно, фестывалі, касцёльная бібліятэка імя Адама Міцкевіча, якая налічвае каля 60 000 кніг і 4 000 сталых падпісчыкаў, каталіцкае радые і тэлепраграма, якія трансліруюцца на ўсю краіну, і шмат чаго іншага ўзнікла дзякуючы энэргіі, намаганням невялікай групы каталікоў, а асабліва адной асобы – ксяндза-магістра Уладзіслава Завальнюка.

Высновы:

У выніку рэпрэсій савецкіх уладаў Рымска-Каталіцкі Касцёл ў Беларусі меў значныя страты сярод духавенства і маёмасці, былі знішчаны і забраны шматлікія святыні і культавыя будынкі. Працэс духоўнага і грамадскага адраджэнне каталіцызма ў канцы 1980-х - 1990-х гадах у Беларусі не з’яўляўся легкім і патрабаваў шмат часу і высілкаў. Адбылося фарміраванне ўласнай адміністрацыйнай структуры Касцёла ў межах рэспублікі, вяртанне раней страчаных святынь, складванне сеткі каталіцкіх парафій на ўсходзе Беларусі і аднаўленне там каталіцкага жыцця. Станоўчыя перамены сталі лагічным вынікам дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця.

**Літаратура**

1. Завальнюк, У. Узняліся крыжы над святынямі / У.Завальнюк – Выданне Касцёла св. Сымона і св. Алены. Мн., 1999. – 204 с.

2. Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыкл. давед. / склад. А.М. Кулагін; маст. І.І. Бокі. – Мінск: БелЭн, 2001. – 216 с.

3. Католицизм на современном этапе развития белорусского общества (религиоведческий анализ) : монография / В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2018. – 168 с.: ил.

4. Святое Евангелле і праблемы перакладу на беларускую мову: Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі па абмеркаванні перакладу Святога Евангелля на сучасную беларускую літаратурную мову. / Пад рэд. У. Завальнюка, М. Прыгодзіча. – Мінск: Рымска-Каталіцкая парафія Святога Сымона і Святой Алены, 2012. – 402 с.

5. In nomine Domini. Мінскі архікатэдральны касцёл Імя Найсвяцейшай Панны Марыі: 300-годдзю кансэкрацыі святыні прысвячаецца – Мінск : Про Хрысто, 2010. – 256 с.: 350 іл.

6. Wikipedia [Электронный ресурс] / Статья в базе свободной энциклопедии Wikipedia – Інтэрнэт, 13 ліпеня 2012. – Режим доступа: http://be.wikipedia.org/wiki/Каталіцтва_ў_Беларусі. – Дата доступа: 05.01.2019.

Репозиторий БГПУ